А. Д. Давыдаў, К. В. Казушчык

# ПРАБЛЕМА АЎТЭНТЫЧНАСЦІ АКТА КРЭЎСКАЙ УНІІ 1385 Г.

Адным с дыскусійных пытанняў у гісторыі ўзаемаадносін Польшчы і Вялікага Княства Літоўскага (далей – ВКЛ) з'яўляецца праблема Крэўскай уніі 1385 г. У ліку аспектаў, што выклікаюць спрэчкі сярод даследчыкаў, яскрава вылучаюцца тры асноўныя аспекты: 1) прычыны і ініцыятар заключэння крэўскага пагаднення; 2) сам Крэўскі акт, яго характар, асобныя палажэнні; 3) аўтэнтычнасць Крэўскага акта. Апошні клубок спрэчак з'яўляецца цэнтральнай тэмай нагаша даклада. Ён завязаўся ў другой палове XX ст., калі пад сумненне была пастаўлена аўтэнтычнасць акта Крэўскай уніі. Фармальна гэты дакумент з'яўляецца пратаколам венгерска-польскага пасольства да вялікага князя літоўскага Ягайлы, у якім зафіксаваны ўмовы шлюбу апошняга з польскай каралевай Ядвігай [1, s. 1 – 3]. Польскі бок прапаноўваў Ягайле ажаніцца з непаўналетняй польскай каралевай і заняць каралеўскі трон у Кракаве. Са свайго боку Ягайла быў павінен выканаць шэраг умоў: прыняць каталіцтва; распаўсюдзіць гэту веру сярод сваіх неахрышчаных братоў, сваякоў і падданых; вызваліць палонных хрысціян, у асноўным палякаў; за ўласны кошт вярнуць страчаныя Літвой і Польшчай землі. З катэгарычнымі абвяржэннямі сапраўднасці Крэўскага акта выступіў літоўскі эміграцыйны гісторык Ё. Даінаўскас у артыкуле, надрукаваным у 1976 г. у Чыкага, пераклад якога на польскую мову выйшаў у 1987 г. [2, s. 125 – 144]. Даследчык сцвярджаў, што, так як акт быў апублікаваны толькі ў XIX ст., то раней яго, быццам бы, не ведалі прадстаўнікі польскай і літоўскай эліт. Акрамя таго, па яго меркаванні, формы ўжытых у тэксце тытулаў былі анахранічныя, а падвешаныя пячаткі не адпавядалі сітуацыі жніўня 1385 г. Выклікаў сумненне Ё. Даінаўскаса і не маючы аналагаў фармуляр дакумента, а таксама тое, што ён захоўваўся не ў каралеўскім архіве на Вавелі, а ў архіве Кракаўскага капітула. Літоўскі даследчык смела заявіў, што дакумент, вядомы зараз як акт Крэўскай уніі, з'яўляецца падробкай, зробленай у XVI – XVII стст. Артыкул Ё. Даінаўскаса справакаваў з'яўленне шэрагу публікацый польскіх медыявістаў, якія паказалі тэндэнцыйнасць і беспадстаўнасць яго сцвярджэнняў [3, s. 473 – 479]. Аргументаваная крытыка меркаванняў Ё. Даінаўскаса была выказана ў фундаментальным артыкуле М. Качэрскай. Яна абвергла тэзіс аб тым, што Крэўскі акт стаў вядомы толькі ў XIX ст. Польская даследчыца пераканаўча паказала, што гэты дакумент быў вядомы і ў сярэдзіне XV ст. На яго спасылаўся ў сваёй хроніцы Ян Длугаш, які тэндэнцыйна пераказаў дакумент, замяніўшы дзеяслоў applicare (прысоўваць, злучаць) на incorporare (уключаць, паглынаць). Былі ліквідаваны сумненні і адносна сапраўднасці прымацаваных да дакумента пячатак князёў Карыбута, Лугвена і Вітаўта, а таксама выкарыстанай у акце тытулатуры [4, s. 59 – 80]. Так, паступова праблема праўдзівасці самаго дакумента была знята, і ракурс спрэчак змясціўся ў напрамку пытання, ці можна яго называць актам "уніі" і г.д. Такім чынам, Крэўская ўнія 1385 г. адносіцца да ліку найважнейшых падзей у гісторыі адносін паміж ВКЛ і Польшчай і мінулым ўсяго Цэнтральна- і Усходнееўрапейскага рэгіёна. Паяднаўшы лёсы дзвюх дзяржаў, яна атрымала асаблівае значэнне для іх далейшага развіцця. З прычыны адмысловай важнасці Крэўская ўнія працягвае даваць глебу для з'яўлення новых гіпотэз і спрэчак навукоўцаў.

### *Список литературы*


1. Akta unji Polski z Litwą. 1385 – 1791/ wyd. S. Kutrzeba i W. Semkowicz. – Kraków: Skład główny w księgarni Gebethnera i Wolffa, 1932. – 633s.
2. Dainauskas, J. Autentyczność aktu krewskiego/ J. Dainauskas// Lituano-Slavica Posnaniensia. – T. 2. – 1987. – S. 125 – 142.
3. Korczak, L. O akcie krewskim raz jeszcze (na marginesie rozprawy J. Dainauskasa)/ L. Korczak// Studia Historyczne. – R.34. – 1991. – № 3. – S. 473–479.
4. Koczerska, M. Autentyczność dokumentu unii krewskiej 1385 r./ M. Koczerska// Kwartalnik Historyczny. – R. 99. – 1992. – № l. – S. 59–80.


*Казущик Кирилл Валерьевич*, студент ФИТиУ, Белорусского государственного университета информатики и радиоэлектроники, kastys1@yandex.ru
*Давыдов Андрей Денисович*, студент ФИТиУ, Белорусского государственного университета информатики и радиоэлектроники, andaw7@rambler.ru
*Научный руководитель: Николаева Людмила Викторовна*, кандидат исторических наук Белорусского государственного университета информатики и радиоэлектроники, доцент, Mikalayeva@bsuir.by.

Библиотека БГУИР